# ПРАБЛЕМЫ СЯМ'І ВАЧЫМА СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

**В.А. СКАЧКОВА**
*Гомельскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО"*

Даследаванні жыццёвых стратэгій студэнтаў і іх уяўленняў аб розных баках жыцця чалавека актуальныя, дазваляюць прагназаваць будучыню саміх маладых людзей і ўсяго грамадства.

Важнасць даследавання уяўленняў моладзі пра сям'ю вызначаецца і глыбокімі трансфармацыямі, якія адбываюцца ў сферы шлюбна-сямейных паводзін. Практыка сужыцця, гасцявыя шлюбы, рост колькасці разводаў, адкладзенае бацькоўства

коўства, павелічэнне колькасці людзей, якія свядома выбіраюць бяздзетнасць ці адзіноту – такія рэаліі нашага часу.

У святле гэтага асаблівую сацыяльную значнасць набывае аналіз сямейных арыенціраў моладзі, яе жыццёвых стратэгій.

Студэнтам Гомельскага філіяла Міжнароднага ўніверсітэта "МІТСО" было прапанавана напісаць эсэ на тэму "Сучасная сям'я: праблемы". Аналіз прац студэнтаў паказаў, што сучасную моладзь хвалююць тыя ж праблемы, якія непакоілі і мінулыя пакаленні, але назіраюцца і некаторыя транфармацыі, звязаныя са зменамі грамадскага жыцця, развіццем новых формаў зносін, уяўленняў аб асобе, уяўленняў аб узаемаадносінах бацькоў і дзяцей.

Назіраецца ў цэлым арыентаванасць студэнтаў на стварэнне ўласнай сям'і. У якасці эталоннай для іх з'яўляецца сям'я з двума дзецьмі, у выхаванні якіх прымаюць удзел абодва бацькі.

Але большасць студэнтаў адзначаюць, што не трэба спяшацца са ўступленнем у шлюбныя адносіны. Яны лічаць, што чалавек павінен стать матэрыяльна незалежным, атрымаць адукацыі, прафесію. Сямейнае жыццё ўцягвае маладога чалавека ў новае кола клопатаў, накладвае адказнасць не толькі за мужа / жонку, але і за дзіця. Трэба працаваць, каб забяспечыць сваю сям'ю. Фізічная стомленасць, нервовыя нагрузкі непадрыхтаванага да цяжкасцяў маладога чалавека правакуюць сваркі і канфлікты ў сям'і па дробязях. І сям'я хутка распадаецца.

Студэнты адзначаюць, што свет апанавала раўнадушша, абыякавасць, эгаістычнасць. Мы ўсё часцей пазбягаем рэальных зносін, замяняючы іх зносінамі ў сацыяльных сетках. І гэтая абыякавасць праяўляецца ў сямейных адносінах. Мы, засяроджаныя на ўласных праблемах, не заўважаем праблем блізкіх людзей.

Маладыя людзі, якія ўступаюць ў шлюб не ўсведамляюць ўсёй адказнасці, якая на іх накладаецца. Яны часам не гатовыя ахвяраваць сваімі інтарэсамі дзеля інтарэсаў сям'і. Дзеці, пазбаўленыя ўвагі сваіх сваіх бацькоў, праецыруюць

такія адносіны спачатку ў дачыненні да сваіх сяброў, пасля мужа / жонкі, пасля да сваіх дзяцей.

Трывожыць, што ні адзін са студэнтаў не напісаў пра каханне ў сямейным жыцці. Мабыць таму што, назіраючы за жыццём сваіх бацькоў, яны не заўважаюць пяшчоты, закаханасці ў іх адносінах. Але мабыць таму, што ў нашым грамадстве каханне лічыцца прыярытэтам толькі моладзі. Сталыя людзі лічаць залішнім паказваць свае эмоцыі.

Здаровыя і шчаслівыя сем'і нясуць вялікую карысць для ўсяго грамадства і дзяржавы. Сярод дзяцей з трывалых сем'яў менш злачынцаў, разумова адсталых, псіхалагічна неўраўнаважаных.

Кожная чацвёртая сям'я ў Беларусі няпоўная, у якой маці ці бацька выхоўваюць адно дзіця ці больш. Студэнты адзначаюць, што недахоп бацькоўскай увагі, клопату, парады, слоў адабрэння не можа не адбіцца на дзіцяці. Нават пасталеўшы, многія з іх да гэтага часу працягваюць адчуваць сябе непаўнавартаснымі, няўпэўненымі і пакутаваць псіхалагічнымі засмучэннямі. Таму неабходна фарміраваць усвядомленае бацькоўства, павышаць сацыяльную каштоўнасць як мацярынства, так і бацькоўства. Моладзь, якая ўступае ў шлюбныя адносіны, павінна разумець, што маці і бацька ўносяць роўны ўклад у выхаванне дзяцей, арганізацыю іх побыту і адпачынку, нясуць роўную адказнасць за гармонію сямейных адносін.

Большасць студэнтаў адной з актуальных праблем сучаснай сям'і адзначылі алкагольную залежнасць часцей бацькі ці нават абодвух бацькоў. Бытавое п'янства і алкагалізм адбіваюцца на шлюбным і сямейным жыцці, на членах сям'і, на выхаванні дзяцей, а таксама на працоўнай дзейнасці і грамадскіх паводзінах. У сувязі з частымі, рэгулярнымі выпіўкамі ў сям'і ствараецца напружаная, канфліктная сітуацыя, назіраецца страта самакантролю, маральная дэградацыя, безадказнасць, грэблівае стаўленне да дзяцей. У псіхалагічным дачыненні такая абстаноўка ў сям'і становіцца псіхатраўмуючай для дзяцей.

Сёння для мужчын сям'я – цяжкі цяжар адказнасці, матэрыяльныя растраты, процьма абмежаванняў на асабістае жыццё і забавы.

Студэнты канстатуюць, што жанчыны ў наш час сталі больш актыўнымі, у выніку страты даверу да мужчын, і занялі дамінуючае месца ў грамадстве. Цяпер яны больш часу сталі надаваць самаразвіццю і станаўленню кар'еры, а менш – на выхаванне дзяцей і клопат пра дом, сям'ю. На першым месцы ў сям'і павінна быць маці, але галава сям'і заўсёды бацька, муж. А жонка павінна слухацца, падтрымліваць яго і ісці за ім.

Другая вялікая праблема ў сямейных адносінах – недахоп часу адзін для аднаго. Праца, грамадскае або асабістае жыццё займаюць практычна ўвесь час, так што зусім не застаецца часу на сям'ю. Дзеці ў такіх сем'ях растуць з горкімі пачуццямі крыўды ў сваіх сэрцах, адчуваюць віну за сваё існаванне. Нават муж і жонка сутыкаюцца з праблемай недахопу часу адзін для аднаго. Гэта прыводзіць да сур'ёзных эмацыйных праблем, падману, здрады і разводаў.

Важна, што студэнты ўсведамляюць каштоўнасць моцнай і дружнай сям'і, пабудаванай на даверы і ўзаемапавазе, сям'і, у якой адбываецца выхаванне дзіцяці як асобы, сям'і, у якой прыярытэтам з'яўляецца імкненне быць шчаслівым і рабіць шчаслівым таго, каго ты абраў спадарожнікам сямейнага жыцця.